6. Речица. Дорогой столетий в будущее [к 800-летнему юбилею города / В. М. Лебедева [и др.]. – Речица : ред. газ. «Днепровец», 2013.
7. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. Ч. 2. – Мінск : Беларусь, 1995.
8. Памяць: гіст.-дак. хроніка гарадоу і раёнау Беларусі. Ельскі раён. – Мінск : БелЭН, 2001.
9. Памяць: гіст.-дак. хроніка Лунінецкага р-на. – Мінск : БелЭН, 1995.
10. Памяць: гіст.-дак. хроніка Пінскага р-на. – Мінск : БелЭН, 2003.
11. Памяць: гіст.-дак. хроніка Гродзенскага р-на. – Мінск : БелЭН, 1993.

**А. Г. Трубчык**

## ГАРАДСКОЕ САМАКІРАВАННЕ Ў г. ГРОДНА (1918–1927)

У канцы Першай сусветнай вайны на акупаванай тэрыторыі Беларусі дзейнічалі органы мясцовага самакіравання, вопыт стварэння якіх паходзіў з часоў былой Расійскай імперыі. На падставе «Палажэння аб выбарах» Часовага гарадскога камітэта, зацверджанага нямецкімі акупацыйнымі ўладамі ў канцы 1918 г., 27 лютага 1919 г. адбыліся першыя выбары ў Гродзенскую гарадскую раду. Паводле Палажэння гарадская рада абіралася на год, пасля чаго неабходна было правесці перавыбары. Выбарчым правам валодалі 16 159 чалавек, што складала 53,5 % ад агульнай колькасці насельніцтва Гродна, а таксама вёсак і маёнткаў, якія былі ўключаны немцамі ў тэрыторыю выбарчых акругаў. Паводле нацыянальнага складу выбаршчыкі былі прадстаўлены наступным чынам: 9 628 – яўрэі, 5 084 – палякі, 834 – рускія, 68 – немцы, 48 – беларусы, 41 – літоўцы і інш. [1]. Па колькасці бюлетэняў у выбарах прынялі ўдзел 13 038 чалавек.

У выніку першых выбараў было абрана 36 радных, у ліку якіх былі 22 яўрэі, што ў далейшым негатыўна ўспрынялі польскія ўлады. У 1920 г. супярэчанні па пытанні ўвядзення яўрэйскай мовы ў справаводства магістрата прывяло да самароспуску і часовага спынення працы гарадской рады. У красавіку 1921 г. Гродзенская польскамоўная газета «Новае жыццё» («NoweZycie») пісала аб тым, што «яўрэйскі склад гарадской рады не дэманструе жадання прыняць польскае грамадзянства» [2].

Першае пасяджэнне Гродзенскай гарадской рады, прысвечанае арганізацыйным пытанням, прайшло 5 сакавіка 1919 года. Прэзідэнтам горада быў абраны Эдвард Лістоўскі, віцэ-прэзідэнтам – Эдвард Стэмпнеўскі. Магістрат быў перайменаваны ў гарадское кіраванне, у складзе якога былі арганізаваны чатыры камісіі: харчовая (старшыня – ксёндз А. Курыловіч), фінансава-падатковая (старшыня Ю. Радзеўскі), прававая (старшыня А. Ліпніцкі), камісія па барацьбе з беспрацоўем (старшыня Ю. Бадаш) [3].

Правамоцтва Гродзенскай гарадской рады было пацверджана польскімі органамі кіравання пасля заняцця Гродна 28 красавіка 1919 года. З 15 верасня 1919 г. уступіла ў сілу Распараджэнне Генеральнага камісара ўсходніх зямель Асмалоўскага ад 14 жніўня 1919 г. «Аб увядзенні ў дзеянне ў г. Гродна гарадскога статута» [4].

З гэтага моманту кіраўніка магістрата павінен быў прызначаць павятовы камісар. Прэзідэнт і віцэ-прэзідэнт складалі прэзідыум магістрата, кіравалі на пасяджэннях магістрата і гарадской рады. Зацверджаная прэзідэнтам пастанова магістрата ўступала ў дзеянне на працягу 2 тыдняў. За гэты час неабходна было атрымаць адабрэнне з боку кантралюючага органа ўлады. Павятовы камісар павінен быў праверыць правамоцтва, абгрунтаванасць прынятага рашэння, а таксама яго адпаведнасць кампетэнцыі органаў гарадскога самакіравання.

Лаўнікі магістрата абіраліся з прадстаўнікоў гарадской рады. Іх колькасць не павінна была перавышаць 10 % ад агульнай колькасці радных. На першым арганізацыйным пасяджэнні вызначаўся склад членаў магістрата. Зарплата служачым магістрата выплачвалася з гарадскога бюджэту і вызначалася на пасяджэнні гарадской рады напярэдадні правядзення выбараў у магістрат.

Члены магістрата абіраліся на тры гады па прапарцыйнай сістэме абсалютнай большасцю галасоў. Вынікі выбараў перадаваліся на разгляд і зацвярджэнне павятоваму камісару. У выпадку адмоўнага рашэння неабходна было правесці перавыбары.

У 1919–1920 гг. магістрат складаўся з наступных аддзелаў: адміністрацыйны (начальнік Э. Стэмпнеўскі), фінансавы (начальнік Г. Тарлоўскі), падатковы (Г. Баум), гаспадарчы (начальнік М. Гіршовіч), харчовы (начальнік Ю. Берг), санітарны (гарадскі лекар Д. Лабель), будаўнічы (Е. Чытаржынскі) [5].

Першапачаткова дзейнасць гарадской рады была досыць шырокай, што было звязана з цяжкасцямі ваеннага часу і адсутнасцю неабходных структур кіравання. Магістрат выконваў гаспадарчую, фіскальную, праваахоўную функцыі: ажыццяўляў нагляд за турмамі, судовымі органамі, працай санітарна-эпідэмічнай службы, кіраваў гарадской камунальнай гаспадаркай, будаўніча-рамонтнымі працамі. На балансе магістрата знаходзіліся гарадская паліцыя, электрастанцыя, скатабойня, гарадскі склад, ламбард, парк, шпіталь, тэатр, бібліятэка, школы і г.д.

Значная ўвага надавалася пытанням харчовага забеспячэння, аховы здароўя, сацыяльнага добраўпарадкавання. У 1919 г. на сацыяльныя патрэбы было выдаткавана больш за 42 % прыбыткаў гарадскога бюджэту [6].

Для павелічэння даходнай часткі бюджэту магістрата гарадская рада ўстанавіла ў 1919 г. шэраг непапулярных сярод насельніцтва падаткаў: падатак для заможных жыхароў горада, падатак за арэнду жылога памяшкання, падатак за карыстанне гарадской бібліятэкай, паслугамі шпіталя, падатак на хатніх жывёл (сабак, кароў, коней ), падатак на ровары і аўтамабілі і інш. Калі ў лютым 1919 г. Часовы гарадскі камітэт збіраў з насельніцтва 7 відаў падаткаў, то ў канцы 1919 г. гарадская рада ўстанавіла 21, а ў 1920 г. – 27 відаў розных падаткаў [7].

Дзейнасць падатковага аддзела магістрата выклікала крытыку з боку прадстаўнікоў павятовай і акруговай улад, якія неаднаразова паведамлялі

ў Генеральны камісарыят Усходніх зямель аб тым, што гарадская рада неправамоцна ўводзіць падаткі і гэта выклікае крытыку з боку мясцовага насельніцтва. У выніку адміністрацыйнага націску быў адменены падатак на ўвоз-вываз тавараў, у выніку чаго магістрат страціў 60 % прыбытку.

У сувязі з уступленнем войскаў Чырвонай арміі ў Гродна 19 ліпеня 1920 г. дзейнасць магістрата была часова спынена. Пасля паўторнага ўстанаўлення польскай улады і вяртання з эвакуацыі кіраўнічых структур на першым пасяджэнні гарадской рады 21 кастрычніка 1920 г. прэзідэнт Э. Лістоўскі абвясціў аб тым, што магістрат працягне працу ў адпаведнасці з распараджэннямі, якія дзейнічалі на тэрыторыі Грамадзянскага ўпраўлення Усходніх земель.

Асноўнымі цяжкасцямі, з якімі сутыкнуўся магістрат ў дадзены перыяд, былі: барацьба з эпідэміямі, забеспячэнне насельніцтва харчаваннем, ахова грамадскага парадку, рамонт гарадской водаправоднай сеткі і электрастанцыі.

На ўтрыманне магістрата была прынята пажарная служба, якая атрымала новае абмундзіраванне і коней. Магістрат падтрымаў дзейнасць польскіх дабрачынных арганізацый, вылучыўшы на грамадскую апеку 5,86 % бюджэту. Паступова на баланс магістрата пераходзілі гарадскія польскія школы. Па патрабаванні гродзенскага школьнага інспектара Рафала Вазнякоўскага гарадская рада прыняла рашэнне ўвесці школьны падатак і арганізаваць працу школьнага нагляду. Па аналогіі з Польскай дзяржавай, у якой школьны нагляд выконваў функцыю кантролю за выкананнем Закона аб усеагульнай адукацыі ад 4 лютага 1919 г., гарадская рада вызначала сістэму штрафаў бацькам, дзеці якіх не наведвалі школу.

Пасля заключэння Рыжскай мірнай дамовы у 1921 г. на землях Заходняй Беларусі быў уведзены новы адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел – ваяводствы, паветы, гміны, грамады, фарміраваліся адпаведныя органы ўлады.

Горад Гродна стаў цэнтрам Гродзенскага павета Беластоцкага ваяводства. У горадзе знаходзіліся шматлікія адміністрацыйныя установы павятовага значэння: павятовае староства, павятовая камендатура дзяржаўнай паліцыі, Польскі банк, а таксама камандаванне акругі корпуса № III 29-й пяхотнай дывізіі, 76-ы і 85-ы пяхотныя палкі [8].

У 1921 г. аформілася новая структура магістрата, якая складалася з 8 аддзелаў і шэрагу рэфератаў.

Прэзідэнцкі аддзел складаўся з сакратарыята, аддзела кадраў, персанальнага і арганізацыйна-інспектарскага рэферату. Першы займаўся ўладкаваннем на працу чыноўнікаў і службовых асоб магістрата і іншых дзяржаўных ведамстваў, рэгуляваў іх правы, абавязкі і адказнасць, збіраў кваліфікацыйную, дысцыплінарную, прэміяльную камісіі. Арганізацыйна-інспекцыйны рэферат займаўся арганізацыяй ведамстваў і гарадскіх прадпрыемстваў, справамі праверкі ведамстваў, следствамі, апрацоўваў праекты статутаў і палажэнняў розных гарадскіх інстанцый.

У складзе адміністрацыйна-статыстычнага аддзела, які ўзначальваў Станіслаў Калецкі, былі створаны наступныя рэфераты: адміністрацыйны,

вайсковы, статыстычны, харчовы, прамысловы, чыгуначнага руху і бюро рэгістрацыі насельніцтва. Адміністрацыйны рэферат займаўся складаннем кніг сталых жыхароў горада. Служачыя рэферата вялі справы, звязаныя з наданнем грамадзянства, выдавалі грамадзянам даведкі аб маёмасным і сацыяльным стане, прафесіі, пасведчанні асобы. Каб атрымаць пасведчанне, трэба было напісаць заяву ў магістрат, заплаціць канцылярскі збор і дадаць дзве асабовыя фотакарткі. Пасля атрымання пацвярджэння, падпісанага прэзідэнтам горада і кіраўніком аддзела, выдавалася пасведчанне асобы [9].

У функцыі адміністрацыйнага рэферата ўваходзіла выкананне бюджэту ўсіх рэфератаў аддзела, арганізацыя выбараў у органы кіравання мясцовага і дзяржаўнага ўзроўню. Рэферэнты займаліся складаннем пашпартоў сядзібных участкаў, жылых дамоў і іншых пабудоў у г. Гродна. Пашпартызацыя будынкаў праводзілася па ўсіх вуліцах, завулках і плошчах горада. У выніку на працягу 1923–1924 гг. было складзена апісанне будынкаў 103 вуліц, завулкаў і плошчаў.

Статыстычны рэферат збіраў, апрацоўваў і друкаваў статыстычныя матэрыялы па ўсіх галінах дзейнасці самакіравання.

Бюро рэгістрацыі насельніцтва займалася пошукам адрасоў, ажыццяўляла кантроль за ўлікам картак рэгістрацыі жыхароў горада, вяло лісты выбаршчыкаў у Сейм і Сенат, а таксама школьны ўлік дзяцей ва ўзросце да 7 гадоў. Служачыя бюро складалі спісы рэпатрыянтаў, якія прыбылі ў Гродна ў 1921–1923 гадах.

Ваенны рэферат вёў улік прызыўнікоў, выдаваў ваенныя пасведчанні, арганізоўваў пастой ваенных, займаўся мабілізацыяй. Харчовы рэферат забяспечваў горад харчаваннем, кантраляваў цэны на тавары першай неабходнасці. Прамысловы рэферат рэгістраваў рамесныя, вытворчыя і гандлёвыя прадпрыемствы. Рэферат чыгуначнага руху займаўся справамі чыгункі, а таксама вызначаў парадак руху і месцы паркоўак для коней, аўтамабіляў, аўтобусаў і таксі.

Аддзел асветы і культуры пад кіраўніцтвам Р. Вазнякоўскага складаўся з рэферата асветы і рэферата культуры. У аддзеле працавалі рэферэнты, якія кантралявалі дзейнасць школ і культурна-асветніцкіх устаноў, выхаваўчую працу дзіцячых дамоў, падрыхтоўку настаўнікаў, перыядычны друк.

У аддзел сацыяльнага забеспячэння і аховы здароўя (узначальваў С. Астрынскі) уваходзілі рэфераты: 1) сацыяльнага забеспячэння, які арганізоўваў акцыі дапамогі беспрацоўным; 2) санітарны рэферат (грамадскай гігіены), які кантраляваў санітарны стан горада; 3) рэферат бальнічнай справы, які кантраляваў дзейнасць гарадской бальніцы і бальнічнай рады.

У кампетэнцыю гаспадарчага аддзела ўваходзілі пытанні продажу, канфіскацыі, перадачы ў карыстанне прыватным асобам і арганізацыям дзяржаўных зямельных участкаў у г. Гродна. Рэферат гарадской маёмасці гаспадарчага аддзела займаўся складаннем спісу дзяржаўных будынкаў з інвентаром, улікам пляцаў, наглядам за абсталяваннем вуліц і плошчаў, страхаваннем маёмасці і інш.

Аддзел накіроўваў у бухгалтэрыю спіс гарадскіх будынкаў, якія належалі магістрату. У спісе за 1927 г., які быў складзены ў выглядзе табліцы, былі прыведзены 87 будынкаў з указаннем колькасці паверхаў і матэрыялаў аб'ектаў, мелася інфармацыя аб установах, якія размяшчаліся ў дадзеных будынках.

У складзе тэхнічнага аддзела, якім кіраваў С. Цыдзік, працавалі рэфераты: метрычны, дарожны, будаўнічы. У сярэдзіне 1920-х гг. будаўнічы рэферат вылучыўся ў асобны аддзел, які займаўся правядзеннем будаўнічых прац і захаваннем усіх дзяржаўных будынкаў, зацвярджэннем праектаў прыватных пабудоў, выдачай дазволаў на будаўніцтва, утрыманнем бетоннага завода ў горадзе, рамонтам гарадскіх вуліц і плошчаў, аховай помнікаў архітэктуры [10]. Функцыі будаўнічага аддзела часта перасякаліся з функцыямі гаспадарчага. Так, будаўнічы і гаспадарчы аддзелы былі адказнымі за складанне планаў і праектаў дзяржаўных пабудоў: ратушы, будынка магістрата, крамаў, шпіталяў і інш.

Дарожны рэферат тэхнічнага аддзела займаўся перабудовай і добраўпарадкаваннем гарадскіх вуліц і плошчаў, іх перайменаваннем. Ён быў адказны за рамонт ходнікаў, дарог, рэгуляцыю берагоў р. Нёман і р. Гараднічанка, за будаўніцтва і захаванне мастоў [10]. У 1921 г. пад аховай горада знаходзіліся масты праз р. Гараднічанка на падаўжэнні вул. Паштовай, два масты па вул. Ажэшкі, адзін з якіх на перасячэнні з вул. Станіславоўскай, мост праз яр па вул. Грандзіцкай і жалезны віадук на вул. Казачай [11, арк. 2].

У 1921–1925 гг. дарожны рэферат кіраваў працамі па ўмацаванні і ўладкаванні моста праз р. Гараднічанка па вул. Ажэшкі. Перабудова гэтага моста прыпыніла рух транспарта па адной з галоўных гарадскіх камунікацыйных артэрый, што вяла да чыгуначнага вакзала. Гэта выклікала абурэнне жыхароў вуліцы, якія накіравалі скаргі ў магістрат, а затым звярнуліся да пасла ў Сейм, каб паскорыць працэс уладкавання моста. Рух па мосце быў дазволены 14 мая 1925 г. Для яго была распрацавана агароджа па праекту інжынера М. Раманава, выкананая майстэрняй П. Бароўскага [11, арк. 15].

У 1925 г. у гарадскім парку ўзведзена прыгожая агарожа, праект якой быў прапанаваны кустaшам музея Ю. Ядкоўскім у стылі работ французскага архітэктара XVIII ст. Ф. Бландэля. Выкананнем праекта займалася рамесная яўрэйская школа імя Э. Брэгмана [12].

Аддзел займаўся арганізацыяй перабудовы электрастанцыі ў 1922–1923 гг., будаўніцвам лядоўні і гандлёвых радоў на Сенным рынку [13]. У яго склад ўваходзіў рэферат вымярэнняў, які выконваў агульны план памераў горада, рыхтаваў планы памераў усіх гарадскіх будынкаў, сквераў, плошчаў і г.д., вёў кадастравую кнігу нерухомай маёмасці на тэрыторыі горада [10]. У г. Гродна рэферат дзейнічаў пад назвай «бюро вымярэнняў».

Гаспадарчы аддзел, у склад якога ўваходзілі рэфераты гарадской маёмасці, ачысткі горада, гарадскога азелянення, пажарная служба, узначальваў Р. Савіцкі.

У фінансава-падатковым аддзеле працавалі падатковы, бюджэтны і выканаўчы рэфераты. У функцыі бюджэтнага рэферата ўваходзіла апрацоўка праекта гарадскога бюджэту. Праз дзейнасць падатковага аддзела можна даследаваць разнастайныя сферы жыцця горада. Так, кніга рэгістрацыі падаткаў за правядзенне публічных відовішч дазваляе скласці ўяўленне аб дзейнасці гарадскога тэатра, кінатэатраў, школ танцаў, клубаў, адукацыйных устаноў, грамадскіх таварыстваў у 1919–1920 гадах. У аддзел накіроўваліся ведамасці па адпрацаваных днях кантралёраў па продажы білетаў у кінатэатры і на іншыя мерапрыемствы. Затым гэтыя ведамасці перадавалі ў персанальны рэферат з просьбай фінансава-падатковага аддзела выплаціць узнагароджанне кантралёрам [14].

Кожны кінатэатр, тэатр, іншыя арганізатары ўсіх платных публічных мерапрыемстваў накіроўвалі ў магістрат дэкларацыі. У іх паведамляліся дата, адрас, назва мерапрыемства і кошт білетаў, якія даюць ускосныя звесткі пра колькасць наведвальнікаў мерапремства. Кожны кінатэатр накіроўваў у магістрат інфармацыю аб фільмах, якія дэманстраваліся. У паперах пералічваліся назвы фільмаў, час іх правядзення, кошт уваходных білетаў.

Некаторыя цыркі, якія прыязджалі з гастролямі, звярталіся ў магістрат з просьбай паменшыць падатак ад прадстаўлення. Просьбы накіроўваліся ў падатковы рэферат, а рашэнне прымалася на пасяджэннях магістрата. У 1927 г. памер падатку ад продажу цыркавых білетаў знізіўся на 20 % [15].

Аддзел гарадскіх прадпрыемстваў складаўся з бухгалтэрыі, рэферата арганізацыі і развіцця прадпрыемстваў, рэферата кантролю прадпрыемстваў. У вядзенні аддзела быў водаканал і мясцовая электрастанцыя. Рэферат кантролю займаўся ўлікам абанентаў электрастанцыі і водаканала. Гродзенскі водаканал накіроўваў у рэферат кантролю спісы гараджан, якія не аплочвалі карыстанне вадой, затым іх справы перадаваліся ў суд [16].

У 1926 г. пры магістраце быў створаны праўны аддзел, кіраўніком якога прызначылі адваката В. Нелюбовіча, а рэферэнтам – К. Гутмана.

Пасля выбараў 1927 г. кампетэнцыя гарадской рады акрэслілася наступным чынам: устанаўленне прынцыпаў і спосабу выкарыстання гміннай маёмасці; набыццё і продаж нерухомай маёмасці, справы пазыкі і размяшчэння капіталаў; прынятце гарадскога бюджэту і надзвычайных выдаткаў, а таксама ўнясенне змяненняў у гарадскі бюджэт; устанаўленне памеру падаткаў і выплат на карысць гміны; устанаўленне натуральных і грашовых павіннасцей; прадстаўленне ўраду прапаноў у справе арганізацыі на карысць горада прамысловай манаполіі і ўвазных аплат; ануляванне гмінных запазычанняў, спагнанне якіх прызнавалася немагчымым; увядзенне і скасаванне гарадскіх службовых пасад; зацвярджэнне штату членаў магістрата; устанаўленне тарыфаў для брычак, трамваяў, а таксама іншых гарадскіх сродкаў камунікацыі; зацвярджэнне цэн на сродкі першай неабходнасці; наданне ганаровага грамадзянства; рэкамендацыі ў справах змены гмінных межаў; зацвярджэнне планаў будаўніцтва і інш.

У кампетэнцыю магістрата ўваходзіла: выкананне пастаноў гарадской рады, кіраўніцтва гарадской маёмасцю і яе інвентарызацыя; кіраўніцтва гарадскімі прадпрыемствамі, якія непасрэдна падпарадкоўваліся магістрату, і выкананне кантролю за прыватнымі; фарміраванне гарадскога бюджэту і прадстаўленне яго ў вызначаны тэрмін гарадской радзе; распараджэнне даходамі і выдаткамі гміны, размеркаванне гмінных падаткаў і павіннасцей згодна з распараджэннямі і пастановамі гарадской рады; юрыдычнае прадстаўленне гміны; справаздачы перад гарадской радай аб сваёй дзейнасці, выкананні бюджэту, стане гміннай маёмасці і ўстаноў; прадстаўленне павятоваму старасце, ваяводзе і гарадской радзе прапаноў па вядзенні гміннай гаспадаркі; выкананне абавязкаў, даручаных дзяржаўнай уладай і законамі. Выкананне шэрагу абавязкаў магістрат даручаў спецыялізаваным камісіям.

Пасяджэнні магістрата праходзілі два разы на тыдзень (звычайна ў аўторак і сераду, аднак для вырашэння тэрміновых пытанняў магістрат мог збірацца ў любы дзень) і пачыналіся ў 18.30. На працягу года адбывалася каля 100–113 пасяджэнняў магістрата, на якіх было прынята больш за 1 230 пастаноў.

На пасяджэннях магістрата ў 1927 г. разглядаліся і прымаліся рашэнні па пытаннях, якія тычыліся ўсіх сфер жыцця горада:

- аховы здароўя – меры па прадухіленні тыфа, прыняцце ў шпіталь смяротна хворых, кантроль за размеркаваннем прадуктаў харчавання, прызначэнне на пасаду ўрачоў, рэгуляванне дзейнасці аптэк, санітарныя мерапрыемствы;
- сацыяльнай сферы – выданне беспрацоўным і малазабяспечаным жыхарам абедаў на танных кухнях, наданне грамадзянства, выплаты служачым за выкананне спецыяльных даручэнняў магістрата (напрыклад, за пошук асоб, прыдатных для службы ў войску давалася 15 грошаў за асобу);
- падаткаабкладання – налічэнне і скасаванне падаткаў, усталяванне зніжак аплаты за карыстанне электрычнасцю для арганізацый, выданне субсідый, будаўніцтва гарадской электрастанцыі, выплаты за арэнду памяшканняў для магістрата, рэгуляванне працы служачых;
- будаўніцтва – дазволы на будаўніцтва і рамонт гарадскіх аб’ектаў, прапановы па будаўніцтве станцыі выратавання на р. Нёман.
- культуры – інфармаванне гарадской рады аб ахвяраваннях ад прыватных асобаў на рэстаўрацыю аб’ектаў культурнай спадчыны;
- адукацыі – пералічэнне сродкаў для пачатковых школ, выдзяленне стыпендый гімназістам;
- добраўладкавання горада – устанаўленне колькасці вазоў на пастоях (напрыклад, на вакзале магло стаяць 25 вазоў, а на рагу Замкавай вуліцы і плошчы Баторыя – 6), забарона пілаваць дрэвы ў горадзе без дазволу магістрата, прадухіленне незаконнага карыстання электрычнай сеткай, устанаўленне коштаў на брукарскія працы, размеркаванне ахвяраванняў [17, с. 356].

Такім чынам, праз пастановы магістрата і гарадской рады можна больш дэталёва даследаваць палітыку польскіх улад у Гродне, а таксама праз разгляд дзейнасці асобных чыноўнікаў скласці ўяўленне аб іх адносінах да мясцовага насельніцтва.

ЛІТАРАТУРА

1. *Kołecki, S.* Przeglad statystyczny m. Grodna za lata 1922 i 1923 / S. Kołecki. – Grodna, 1925. – 320 s.
2. Дневники заседаний городской рады 1919–1922 гг. // Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (ДАГр). – Ф. 46. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 270.
3. Z Zarządu Miejskigo // Nowe Zycie. – 1919. – № 13 (16 marca). – S. 103–104.
4. Zarządzenie Komisarza Generalnego Ziem Wschodnich, dotyczącze wejścia w życie w m. Grodnie ustawy miejskiej z dnia 14 sierpnia 1919 r. DUZCZW. – № 19 (23 września 1919 r.). – Poz. III–177.
5. ДАГр. – Ф. 46. Воп. 1. Спр. 147. Арк. 3–6.
6. Журнал учета налогов 1919 г. // ДАГр. – Ф. 46. Воп. 1. Спр. 143. Арк. 1–185.
7. Распоряжения магистрата об порядке уплаты налогов 1919–1920 гг. // ДАГр. – Ф. 46. Воп. 1. Спр. 141. Арк. 3–24.
8. *Milewski, J.* Grodno – miasto i ludność w okresie międzywojennym / J. Milewski // Grodno w XVIII wieku. Miasto i ludność. – Białystok, 1997. – S. 198.
9. ДАГр. – Ф. 46. Воп. 1. Спр. 26. Арк. 3.
10. ДАГр. – Ф. 46. Воп. 1. Спр. 256. Арк. 145.
11. ДАГр. – Ф. 46. Воп. 1. Спр. 274.
12. ДАГр. – Ф. 46. Воп. 1. Спр. 276. Арк. 78.
13. ДАГр. – Ф. 46. Воп. 1. Спр. 278. Арк. 13.
14. ДАГр. – Ф. 46. Воп. 1. Спр. 307. Арк. 339.
15. ДАГр. – Ф. 46. Воп. 1. Спр. 326. Арк. 151.
16. ДАГр. – Ф. 46. Воп. 2. Спр. 7. Арк. 2.
17. *Казак, Т.* Дакументы магістрата г. Гродна 1919–1939 гг. у фондах Дзяржаўнага архіва Гродзенскай вобдасці / Т. Казак // Гарадзенскі палімпсест. Дзяржаўныя ўстановы і палітычне развіцё. XV–XX. – Гародня, 2009.

**И. С. Благуш**

## ЭКСПОРТНЫЙ ПОТЕНЦИАЛ ПРОМЫШЛЕННОСТИ В УСЛОВИЯХ ПОСТИНДУСТРИАЛЬНОГО РАЗВИТИЯ: УРОКИ ГЕРМАНИИ И ВЫЗОВЫ ДЛЯ БЕЛАРУСИ

Постиндустриализация в мировой экономике сопровождается существенным расширением и изменением роли сферы услуг, рассматриваемой экспертами и политиками в последние десятилетия в качестве основного и наиболее перспективного драйвера экономического роста. Этот процесс затрагивает и развитые страны, где доля сектора в ВВП с 1997 по 2015 г. увеличилась с 69 до 74 %, и страны развивающиеся, доля которых в мировом экспорте услуг, составлявшая в 1989 году всего 12 %, в 2016 г. существенно возросла и достигла 21 %, формируя пятую часть глобальных продаж в сегменте. В странах ОЭСР более 70 % рабочих мест сосредоточены в сфере